– обеспечить своевременную и систематическую подачу интересных новостей;

– публикации постов должны носить постоянный характер (не реже 4 раз в неделю);

– белорусским издательствам следуют внедрять следующие инструменты маркетинга: буктрейлеры, опросы, тесты, инфографику, хэштеги, а также следить за тенденциями дизайнерского оформления визуального материала к постам.

УДК 821.161.3(082)

К. Т. Тарасевіч, студэнтка 4 курса
У. І. Куліковіч, дацэнт, канд. філал. навук
(БДТУ, Мінск)

КАНЦЭПЦЫІ СУЧАСНЫХ ЗБОРАЎ ТВОРАЎ БЕЛАРУСКАЙ КЛАСІКІ

Уводзіны. Згодна са слоўнікам, Збор твораў — від выдання, якое канцэнтруе ў аднатыпна афармленых адзінках (тамах) усе або асноўныя творы аднаго аўтара ў якасці яго навуковай, літаратурна-мастацкай або публіцыстычнай спадчыны [1].

Беларускія навукоўцы маюць багаты вопыт падрыхтоўкі збораў твораў: Я. Коласа і Я. Купалы, М. Танка, К. Чорнага, В. Дуніна-Марцінкевіча, Л. Геніюш і іншых (большасць з іх пабачыла свет у выдавецтве «Мастацкая літаратура»). Аднак на сучасным этапе існуе вострая запатрабаванасць у новых зборах твораў беларускіх аўтараў, у тым ліку, у перавыданнях: пасля распаду СССР з'явілася магчымасць паказаць творчасць вядомых аўтараў «без купюр», былі знойдзены новыя матэрыялы адносна жыцця і творчасці аўтараў (у тым ліку, новыя творы). Акрамя таго, зборы твораў паказваюць чытачу веліч і значнасць беларускай класікі ў сусветным кантэксце і такім чынам спрыяюць папулярызацыі айчыннай культуры. А вывучэнне досведу падрыхтоўкі сучасных збораў твораў дапаможа вызначыць шляхі далейшага развіцця галіны.

Задача даследавання — прааналізаваць зборы твораў В. Быкава і У. Караткевіча і ўстанавіць асноўныя аспекты іх канцэптуальнай падрыхтоўкі.

Асноўная частка. Прыжыццёвы збор твораў В. Быкава, які пабачыў свет ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» ў 1992–1994 гг, мае сціплае знешняе афармленне: на чорнай цвёрдай вокладцы змяшчаецца толькі вылучанае колерам і падкрэсліваннем імя аўтара і нумар тома. Канцэптуальна дадзенае выданне падобнае да мадэлі масавых збораў твораў, якія ажыццяўляюцца на падставе тэкстаў навуковага выдання, але ўключаюць толькі асноўныя творы і невялікі апарат, разлічаны на папулярызацыю творчай спадчыны пісьменніка [1]. Аднак, на жаль, даведачны апарат збору твораў В. Быкава 1992–1994 гг. не ўтрымлівае інфармацыі пра тое, паводле якога выдання і ў якой рэдакцыі друкуюцца тэксты, па якім прынцыпе размеркаваныя творы. Толькі ў першым томе ёсць прадмовы з аналізам творчасці В. Быкава і асобных яго твораў у гістарычным кантэксце.

На сёння найбольш змястоўным з'яўляецца поўны збор твораў В. Быкава ў 14-ці т., які друкуецца ў Маскве ў выдавецтве «Время» з 2005 г. Як адзначылі каардынатары праекта, «выданне павінна было стаць не чарговым, не акадэмічным выданнем поўнага збору мастацкіх твораў Быкава, а агульнанацыянальным праектам» [2], «…тым вечным помнікам пісьменніку, да якога будуць прыходзіць новыя пакаленні беларускіх чытачоў не толькі ў Мінску, але і ў розных кутках нашай Беларусі» [3]. Дадзены збор будзе цікавы спецыялістам, бо ён фактычна з'яўляецца адлюстраваннем апошніх дасягненняў айчыннай тэксталогіі і з'яўляецца вынікам шматгадовай крытычнай, гістарычнай і рэдактарскай працы навукоўцаў. Пры ўкладанні найперш улічвалася думка самога В. Быкава. Выданне мае сціплае, але густоўнае афармленне: на пераплёце кожнай кнігі змешчаны імя аўтара, тып выдання (поўны збор твораў) і нумар тома.

Прозвішча, нумар і рыскі над ў (нескладовым) вылучаны чырвоным колерам; усе астатнія элементы вокладкі чорныя, шэрыя альбо белыя. Навукова-даведачны апарат утрымлівае глыбокія каментарыі з інфармацыяй пра першыя выданні, іх даціроўку, гісторыю правак тэксту, працу з архіўнымі матэрыяламі; прадмовы і паслямовы ад рэдкалегіі, дзе апісваецца структура канкрэтнага тома і збору твораў у цэлым; аўтарскія прадмовы з характарыстыкай постаці В. Быкава і яго ролі ў беларускай літаратуры; шырокія анатацыі на рускай і беларускай мовах.

Кніга «Творы» У. Караткевіча 1996 г. (выдавецтва «Мастацкая літаратура») крыху адрозніваецца знешне, але, па сутнасці, з'яўляецца дзявятым томам збору 1987–1991 гг. Выданне мае простае афармленне: на светлым пераплёце змешчана імя аўтара, упрыгожанае залатой цісненай віньеткай, першая літара прозвішча надрукавана рукапісным кеглем. На карашку, акрамя імя, прысутнічае нумар тома. Першапачатковая задача, якую рашалі выдаўцы, — задаволіць попыт чытача на самыя вядомыя творы Караткевіча [4]. Таму ў апарат збору ўваходзяць толькі самыя неабходныя тэксталагічныя і літаратуразнаўчыя каментарыі. Сярод іншых складнікаў апарата — алфавітныя даведнікі з пазнакай нумара тома і старонкі, на якой знаходзіцца той ці іншы твор; паслямовы з літаратуразнаўчай крытыкай; летапіс жыцця і творчасці.

Са з'яўленнем новых даследаванняў спадчыны Караткевіча, адкрыццём дадатковых звестак пра яго жыццё і творчасць з'явілася неабходнасць у новым выданні твораў пісьменніка. І ў 2012 г. у выдавецтве «Мастацкая літаратура» пабачыў свет першы том поўнага навукова каментаванага выдання яго творчай спадчыны. Выданне акадэмічнага тыпу, яно адрасавана шырокаму колу чытачоў. Мэта — каб кожная кніга збору была запатрабавана. Таму вялікая ўвага надаецца матэрыялам, якіх яшчэ наш чытач не бачыў (напрыклад, малюнкі, дзённікі і запісныя кніжкі Караткевіча). Выкарыстоўваецца,

таксама, і не звычайны для збору твораў фармат падачы матэрыялаў: плануецца ўключыць у склад выдання кампакт-дыскі з выступленнямі пісьменніка на радыё і тэлебачанні, электроннымі версіямі твораў. [5]. Як і папярэднія, збор твораў мае сціплае афармленне: на шэрай аплётцы змешчаны імя аўтара (упрыгожанае рукапіснымі ініцыяламі), тып выдання (збор твораў) і нумар тома. На белым карашку маюцца шэрыя стылізаваныя ўстаўкі з элементамі зямнога рэльефу.

Навукова-даведачны апарат складаецца з наступных частак: прадмова ад рэдкалегіі з апісаннем канцэпцыі збору, прадмова з гісторыка-літаратурным аналізам творчасці пісьменніка; пасляслоўе з літаратуразнаўчым аналізам канкрэтных твораў; іншыя рэдакцыі і варыянты твораў; алфавітны даведнік; каментарыі, якія ўтрымліваюць звесткі пра асноўную крыніцу, гісторыю тэксту і г. д. Адметны прынцып будовы зместу ў тамах з вялікай колькасцю тэкстаў: пазначаюцца не толькі старонкі, на якіх змешчаны асноўны тэкст, але і старонкі з каментарыямі і іншымі рэдакцыямі, што вылучае дадзены Збор твораў сярод іншых кніг з выбранымі тэкстамі У. Караткевіча.

Заключэнне. Укладальнікі сучасных збораў твораў імкнуцца паказаць вядомага аўтара з невядомага чытачам боку. Такія выданні з’яўляюцца не толькі «помнікам пісьменніку», але і адлюстраваннем апошніх дасягненняў айчыннай філалогіі, таму цікавыя і для спецыялістаў. Апарат збораў пач. XXI ст. значна пашыраны, часта ён уключае некалькі прадмоў, падрабязныя каментарыі, іншыя рэдакцыі і варыянты твораў, алфавітны даведнік і інш. Некаторыя матэрыялы могуць быць прадстаўлены на кампакт-дысках (збор твораў У. Караткевіча ў 25 тамах).

Развіццё паліграфічнай базы таксама станоўча паўплывала на падрыхтоўку Збораў. Іх афармленне адметнае мінімалізмам, яскравая тэндэнцыя — выкарыстанне тыпаграфікі як самастойнага стылістычнага элемента.

ЛІТАРАТУРА

1. Собрание сочинений — это… Что такое Собрание сочинений // Академик. — Код доступа: http://dic.academic.ru/-dic.nsf/bse/133736/Собрание. — Дата доступа: 14.07.2016.

2. «Поўны збор твораў Быкава — агульнанацыянальны праект» / В. Аксак. — 19.06.2008. — Рэжым доступу: http://www.svaboda.org/a/1140674.html. — Дата доступу: 14.07.2016.

3. Прэзентаваны поўны збор твораў Васіля Быкава / Прэс-служба ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў». — 18.02.2008. — Рэжым доступу: http://old.baj.by/ru/node/-1551. — Дата доступу: 14.07.2016.

4. Кенька, М. Асаблівасці тэксталогіі збору твораў Уладзівіра Караткевіча (з вопыту ўкладальніка) / М. Кенька. — Рэжым доступу: http://elib.bsu.by/bitstream/123456789/141517/1/КенькаМ_Асаблівасці тэксталогіі збору твораў Уладзіміра Караткевіча.pdf. — Дата доступу: 13.07.2016.

5. Паўлючэнка, В. Спадчына Караткевіча: захаваем разам / В. Паўлючэнка. — Рэжым доступу: http://www.main.lim.by/?p=905. — Дата доступу: 14.07.2016.